Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №3(54), Ч2, 2009

*УДК 398.3(=161.3):929 (093)*

# Гісторыя збірання і вывучэння прыкмет і павер’яў

А. А. Кастрыца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Першыя публікацыі прыкмет і павер’яў, у параўнанні з іншымі жанрамі вуснай народнай творчасці, з’явіліся даволі позна – у XIX стагоддзі. Так, у 1853 годзе выходзіць у свет “Даследаванне пра ваўкалакаў на аснове беларускіх павер’яў” П. Шпілеўскага [25], у якім аўтар звяртае ўвагу на багацце беларускай народнай вусна-паэтычнай культуры і недастатковую вывучанасць розных з’яў айчыннай даўніны: “Беларусь настолькі знакаміта сваімі паданнямі, што, калі ведаеш пра ўсё гэта, шкадуеш, – чаму да нашага часу навукоўцы не жадаюць звярнуць увагу на гэты край і вывучыць яго ва ўсіх галінах айчыннай даўніны. А Беларусь вартая таго. Гэты куточак нашай Айчыны па справядлівасці можна назваць сталіцай старажытнай славянска-рускай міфалогіі: там выток усіх язычніцкіх вераванняў продкаў нашых” [25, с. 1-2].

У 1858 годзе на старонках “Этнаграфічнага зборніка” ў працы “Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню” А. Кіркора была змешчана характарыстыка народных вераванняў беларусаў Віленскай губерні [11]. Дзякуючы даследчыку, у навуковы ўжытак увайшлі прыкметы і павер’і аб розных баках жыцця віленскага селяніна.

У працы “Збор песень, казак, абрадаў і іншых звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю”, выдадзенай М. Дзмітрыевым у 1869 годзе ў Вільні, асобнай часткай пададзены “суеверия и предразсудки” [7], прадстаўлены звесткі, звязаныя з выклікаsuccessful дажджу, з народнымі ўяўленнямі пра першы гром, з міфалагічнымі вераваннямі, адлюстраванымі ў пахавальнай абраднасці і г.д. Е. Раманаў, ацэньваючы ролю зборніка і яго месца ў кантэксце развіцця тагачаснай беларускай навукі, звярнуў увагу на асобныя недахопы ў размяшчэнні матэрыялаў: “Часам у творах не знаходзілася ніякага сэнсу з-за пропускаў, скажэнняў, мноства памылак друку і няправільнай расстаноўкі знакаў прыпынку” [19, с. I].

Беларускімі прыкметамі і павер’ямі цікавіўся вядомы збіральнік і фалькларыст П.Шэйн. У яго зборніках “Беларускія народныя песні з абрадамі, звычаямі і прымхамі, што да іх адносяцца, з дадаткам тлумачальнага слоўніка і граматычнымі заўвагамі” (1874 г.) і “Матэрыялы для вывучэння быту мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю” (1902 г.) сярод іншых жанраў прадстаўлены прыкметы і павер’і, што датычаць розных бакоў сялянскага жыцця. Е. Раманаў заўважыў, што “шаноўны збіральнік занадта вялікую ўвагу звярнуў на колькасць матэрыялаў на шкоду іх якасці і не зрабіў у іх строгага выбару” [15, с. 6]. На наш погляд, актуальнасць прац П. Шэйна відавочная: важны не толькі сам факт вылучэння прыкмет і павер’яў сярод іншых жанраў як асобных відаў фальклору, але і ўвага да іх зместу і непасрэднай сувязі з жыццёвымі з’явамі.

У артыкуле “Аб прыкметах” (“Мінскія епархіяльныя ведамасці”, 1884 г., № 15-16) сцвярджаецца, што прычынай узнікнення прыкмет, як увогуле і ўсіх прымхаў, з’явіўся страх перад прыродай, якую “язычнік, як вядома, абагаўляў і адносіўся да яе з аднаго боку як да боства спрыяльнага, а з другога – як да боства грознага і страшнага” [15, с. 425-426]. Заўважым, што аўтар дадзенай працы падзяляе прыкметы на 9 груп: 1) прыкметы, звязаныя з добрай і благой сустрэчамі; 2) прыкметы, якія грунтуюцца на асаблівасцях чалавечага цела; 3) прыкметы, звязаныя з трэскам у якой-небудзь частцы дома; 4) прыкметы аб агні і яго праявах; 5) прыкметы аб жывёле; 6) прыкметы, якія датычаць добрых і злых дзён і гадзін; 7) прыкметы адносна нябесных з’яў; 8) прыкметы астралагічнага характару; 9) прыкметы, якія маюць месца ў жыцці чалавека ад яго нараджэння да смерці. Каштоўнасць дадзенага даследавання, на наш погляд, заключаецца не толькі ў падрабязнай для таго часу тэматычнай клас-

іфікацыі прыкмет і павер'яў, але і ў спробе іх навуковага асэнсавання. Да недахопаў можна аднесці жанравае неразмежаванне прыкмет і павер'яў і іх разгляд толькі як прыкмет.

Істотнымі падаюцца прадстаўленыя ў працы З. Радчанка "Гомельскія народныя песні" (1888 г.) міфалагічныя ўяўленні пра Святую Пятніцу і ведзьмаў, якія забіраюць на Юр'я малако ў кароў, робяць заломы, а таксама пра ваўкалакаў, вера ў якіх была надзвычай папулярнай у народзе. Даследчыца робіць выснову, што прыкметы, павер'і і некаторыя забабоны "гомельскіх беларусаў такія ж самыя, як і ў астатняй Беларусі і Маларосіі" [18, с. XIV].

Заслугоўвае ўвагі даследчыкаў этнаграфічны зборнік Дз. Булгакоўскага "Пінчукі" [16], у якім аўтар робіць спробу сістэматызацыі прыкмет і павер'яў у адпаведнасці з пэўнымі тэматычнымі групамі: 1) прыкметы, якія адносяцца да святаў; 2) на розныя выпадкі жыцця (пры палявых работах; пры смерці; пры пахаванні; пасля пахавання; падчас навальніцы; падчас пажару; пры сустрэчы з некаторымі жывёламі; пры выгане жывёлы ў поле; ад хвароб; адносна дзяцей); 3) павер'і пра паходжанне некаторых жывёл; 4) павер'і пра русалак, чараўнікоў; 5) погляды пінчукоў на смерць, замагільнае жыццё [3, с. 178-192].

Заўважым, што прыведзеная класіфікацыя не зусім дасканалая, яна пазбаўлена пэўнай тэматычнай паслядоўнасці, але тым не менш трэба адзначыць важнасць дадзенага даследавання, у якім звяртаецца пільная ўвага на сувязь каляндарных і сямейных абрадаў з прыкметамі і павер'ямі. Увогуле пытанне класіфікацыі прыкмет і павер'яў, як і іншых фальклорных жанраў, надзвычай складанае, таму непрыняцце або строгая крытыка класіфікацыйных схем, прапанаваных даследчыкамі, з'яўляюцца, на наш погляд, не зусім прымальнымі.

У працы У. Дабравольскага "Смаленскі этнаграфічны зборнік" таксама змешчаны прыкметы і павер'і [8], прычым фактычны матэрыял, запісаны на Смаленшчыне, яскрава адлюстроўвае каларыт лакальнай традыцыі: "Пыймать лося, урѣзать правый наги капыта, здѣлать перстинь, насить на рукѣ: на тябе ни придить ни якая злая пригода, ни зёлъ чилавѣк" [8, с. 206]. Выклікае павагу імкненне аўтара захаваць асаблівасці мясцовай гаворкі.

У рабоце М. Федароўскага "Lud Białoruski na Rusi Litewskiej" [26] змешчана вялікая колькасць прыкмет і павер'яў, звязаных не толькі з календаром, жывёльным і раслінным светам, але і звесткі пра міфалагічных персанажаў (Русалка, Начніца, Мара, Ох, Дзікія людзі і інш.), пра чарадзейства і знахарства, пра народную медыцыну і магію, народныя ўяўленні пра смерць і "той свет".

Сярод публікацый, прысвечаных прыкметам і павер'ям, багаццем матэрыялаў, іх разнастайнасцю вызначаецца асобнае выданне М. Нікіфароўскага "Простанародныя прыкметы і павер'і…" [13]. Гэтая праца адрозніваецца багаццем і арыгінальнасцю матэрыялаў па народных ведах і вераваннях. Ва ўступным артыкуле аўтар адзначае, што ў добразычлівых водгуках чытачоў і навукоўцаў на папярэднія яго артыкулы ён знаходзіць "дастатковую маральную падтрымку дзеля выпуску ў свет новай этнаграфічнай працы, …збору прыкмет і павер'яў, з далучэннем да іх прымхлівых абрадаў і звычаяў, а таксама легендарных сказанняў" [13, с. I].

Змешчаны ў зборніку матэрыял этнограф падзяліў на шэраг тэматычных раздзелаў: **А.** Дзеці ад пачатку і да "блазноцтва" (прыкметы цяжарнасці; перасцярогі цяжарным; перасцярогі адносна цяжарных; роды; хрышчэнне; дзіцячыя хваробы; "блазноцтва"); **Б.** Маладыя людзі абодвух палоў: шлюбная пара (павучэнні для жаніхоў і нявест; варожбы; сватанне; вяселле); **В.** Будзённае жыццё дома і за межамі дома (свярбенні; розныя праявы звычайных дзеянняў і з'яў; ежа; піццё; гатаванне хлеба і ежы; дамашнія і палявыя работы; прыгоды сустрэчы; сад; лясныя дрэвы, расліны; "сяліба", дамашнія пабудовы); **Г.** Жывёлы, насякомыя і з'явы прыроды (коні; каровы і валы; авечкі; свінні; сабакі; кошкі; куры; гусі і інш. хатняя жывёла; хваробы і лячэнне дамашняй жывёлы; звяры; птушкі; рыбы; камяні; пара года і час дня; нябесныя і прыродныя з'явы); **Д.** Святочнае жыццё (Каляды; зімнія, веснавыя, летнія і восеньскія святы); **Е.** Да вечара – не рана (вядзьмарства; смяротныя хваробы; смерць; нябожчык; дзяды); **Ж.** Дадатковыя (змешаныя) сказанні.

Безумоўнай станоўчай якасцю зборніка М. Нікіфароўскага "Прастанародныя прыкметы і павер'і…" з'яўляецца тое, што аўтар, у адрозненне ад многіх на той час, пад кожным запісам змясціў дату і месца яго фіксацыі. Дадзеную класіфікацыю прыкмет і павер'яў можна лічыць надзвычай удалай, паколькі яна дазваляе не толькі добра арыентавацца ў вялікім і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разнастайным фактычным матэрыяле, але і прасачыць усё жыццё беларускага селяніна ад нараджэння да смерці.

Першым навуковым даследаваннем вераванняў беларусаў з’явілася праца А. Багдановіча “Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў” [2]. Назіранні і запісы даследчыка пра быт, жыццё і культуру беларускага народа склалі аснову этнаграфічнага нарыса, у якім аўтар звяртаецца “…да абрадаў таму, што ў іх заўважаецца адлюстраванне старажытнага светасузірання, і калі мы апісвалі абрад, звычай, уяўленне, павер’е, то імкнуліся, па меры магчымасці, апісваць яго тыпова, уносячы ў апісанне ўсе вядомыя нам характэрныя асаблівасці” [2, с. II].

А. Багдановіч засяроджвае ўвагу на перажытках старажытных форм рэлігіі ў абрадах беларусаў. Даследчык, характарызуючы асаблівасці іх светасузірання, звяртаецца да вытокаў фетышызму, анімізму, перажыткаў адухаўленняў і сонечнага культу, прыкмет і павер’яў і робіць вывад, што прычынай узнікнення вялікай колькасці ўяўленняў, вераванняў з’яўляюцца асаблівасці гістарычных умоў існавання беларусаў і страх перад сіламі прыроды.

Пытанні вывучэння міфалагічных вераванняў, адлюстраваных у абрадах і звычаях, закранае ў сваёй працы П. Дземідовіч, які гаворыць пра дуалізм у светапоглядзе беларусаў, што ўзнік у дахрысціянскую эпоху і пасля прыняцця хрысціянства, нягледзячы ні на што, застаўся ў асноўных сваіх рысах адным і тым жа: “…усё добрае сваёй крыніцай мае Бога, а нячыстае – д’ябла” [6, с. 91].

Вялікую каштоўнасць маюць працы Е. Раманава. Матэрыялы, змешчаныя ў “Беларускім зборніку” [19], ахопліваюць Гродзенскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні, маюць пашпартызацыю, адрозніваюцца арыгінальнасцю і самабытнасцю. Значная колькасць прыкмет і павер’яў, звязаных з гаспадарчай дзейнасцю селяніна, а таксама міфічныя персанажы, знахарства і чарадзейства – вось кола народных уяўленняў, шырока прадстаўленых у “Беларускім зборніку”.

У 1928 годзе публікуюцца “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны” А. Шлюбскага, на старонках якіх знаходзіцца месца для прыкмет і павер’яў [22]. Адметнымі з’яўляюцца, напрыклад, прыкметы і павер’і, звязаныя з пахавальнай абраднасцю, у якіх важнае месца адведзена тлумачэнням тых ці іншых забарон і парад: “Пры закопванні нябожчыка ў зямлю яго дзеці не павінны кідаць зямлю на труну, каб не пакрыўдзіць нябожчыка, ад гэтага можа быць ранняя смерць таго, хто кідаў зямлю” [133, с. 222].

Важнае значэнне для вывучэння матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларусаў маюць даследаванні Ч. Пяткевіча [17]. “Сваім нашчадкам ён пакінуў унікальныя працы, якія даюць поўнае ўяўленне пра жыццё, непаўторную традыцыйную культуру насельнікаў усходняй часткі беларускага Палесся” [17, с. 13]. Вялікае месца ў працы займаюць народныя ўяўленні, звязаныя з атмасфернымі з’явамі, а таксама народныя веды па метэаралогіі (прадказанні надвор’я па агню, вадзе, па паводзінах млекакормячых, птушак і г.д.). У склад кнігі ўключаны прыкметы і павер’і пра агонь, ваду, зямлю, чалавека, чарадзейства, а таксама разнастайныя парады і перасцярогі. Асобны раздзел прысвечаны жывёльнаму свету (“насякомыя і чэрві”, “паўзуны і гады”, “птушкі”, “млекакормячыя”) [17, с. 309–344]. Варта адзначыць, што праца Ч. Пяткевіча “Рэчыцкае Палессе”(1928 г.) мае несумненную каштоўнасць для фалькларыстычнай навукі, паколькі вылучаецца не толькі шматаспектнасцю і дэталёвасцю паказу паўсядзённага жыцця чалавека-працаўніка, але і навуковым падыходам да асэнсавання многіх з’яў традыцыйнай культуры беларусаў.

Значнай па колькасці і якасці сабранага матэрыялу з’яўляецца даследаванне К.Машынскага “Kultura ludowa słowian” (1934 г.) [27]. На старонках гэтай кнігі змешчаны прыкметы і павер’і пра ўраджай, раслінны і жывёльны свет, атмасферныя з’явы, а таксама звесткі пра лекавую магію і чарадзейства.

Вялікае значэнне для даследавання прыкмет і павер’яў мае праца А. Сержпутоўскага “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (1930 г.), дзе змешчаны вялікі фактычны матэрыял – 2275 запісаў легенд і паданняў, прымхаў і забабонаў, зробленых аўтарам на працягу 40 год у паўднёвай частцы Слуцкага павета. Уключаныя ў зборнік прыкметы і павер’і ўстойліва захаваліся ў народнай памяці і з’яўляюцца важнай крыніцай даследавання светапогляду нашых продкаў. Аўтар удала

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

размеркаваў прыкметы і павер'і па пяці тэматычных групах: 1) прырода (свет, расліны, жывёлы); 2) чалавек (чалавек і яго жыццё, усялякія людзі на свеце); 3) заняткі (гадоўля жывёлы, земляробства і гаспадарства, рамесніцтва, ежа, падарожжа, вопратка, будаўніцтва); 4) звычаі (каляндарныя і сямейныя); 5) вера (богі, духі, пачвары, хвароба і г.д.) [5]. Каштоўнымі ў гэтай працы з'яўляюцца як прынцыпы класіфікацыі матэрыялу, так і яго разнастайнасць, багацце народных уяўленняў, а таксама наяўнасць пашпартызацыі і дакладнасць у занатаванні асаблівасцей мясцовай гаворкі.

Варта заўважыць, што ў полі зроку фалькларыстаў-збіральнікаў XIX і XX стагоддзяў былі не толькі пытанні сістэматызацыі і класіфікацыі прыкмет і павер'яў, але і вывучэнне іх як асобных жанравых адзінак у сістэме фальклору. Так, жанравыя асаблівасці прыкмет і павер'яў даследавалі на матэрыяле рускага фальклору многія вучоныя. Звернем увагу перш за ўсё на працу У. Даля "О повериях, суевериях и предрассудках русского народа", у якой аўтар спрабуе даць азначэнне жанру павер'яў, канстатуючы факт іх наяўнасці ў фальклоры ўсіх народаў свету. Пры гэтым ён адзначае, што "ў многіх народаў яны значна падобны паміж сабой, што ўказвае на адну агульную крыніцу і пачатак, які можа быць трох родаў: ці павер'е, якое ўзнікла ў старажытнасці, да падзелу двух народаў, захавалася ў абодвух; ці, узнікшы ў аднаго народа, распаўсюдзілася і на іншыя, ці, нарэшце, павер'е, па ўласцівасці і адносінах сваіх да чалавека ўзнікла тут і там незалежна адно ад другога" [5, с. 11].

Вучоны падзяляе павер'і на пяць "разрадаў": 1) павер'і – рэшткі язычніцтва; 2) павер'і, прыдуманыя выпадкова, для таго, каб дасягнуць патрэбнай мэты; 3) "павер'і, па сутнасці сваёй, заснаваныя на справе, на вопытах і заўвагах" [5, с. 13]; 4) "павер'і , заснаваныя на з'явах натуральных, якія ператварыліся, аднак, у недарэчнасць паводле бессэнсоўнасці іх прымянення да частых выпадкаў" [5, с. 13]; 5) "пятага разраду павер'і адлюстроўваюць дух часу, гульню ўяўлення, іншасказання – словам, гэта народная паэзія, якая, прынятая за сапраўднасць, ператвараецца ў прымхі" [5, с. 13]. Акрамя таго, аўтар сцвярджае, што ў павер'ях і забабонах знайшлі ўвасабленне рэшткі язычніцтва, якія хрысціянства спрабавала знішчыць. Класіфікацыя павер'яў, прыведзеная У. Далем, уражвае глыбінёй і гісторыка-філасофскай скіраванасцю. Размяшчаючы ў такой паслядоўнасці прыкметы і павер'і, аўтар па сутнасці дае нам карціну іх узнікнення і эвалюцыі ў часе.

На думку А. Афанасьева, вядомага прадстаўніка міфалагічнай школы, прыкметы і павер'і можна падзяліць на дзве групы: 1) "прыкметы, выведзеныя з сапраўдных назіранняў" [1, с. 236]; 2) "прыкметы прымхлівыя, у аснове якіх ляжыць не вопыт, а міфічныя ўяўленні" [1, с. 237].

Істотнай для нас з'яўляецца заўвага А. Афанасьева ("Паходжанне міфа, метад і сродкі яго вывучэння") адносна таго ўплыву, які аказвалі на стварэнне "прыкмет, варожбаў, тлумачэнняў сноў і ўвогуле павер'яў мова, і схільнасць народнага розуму ва ўсім знаходзіць аналогіі" [1, с. 240].

Падкрэслім, што ў савецкай фалькларыстыцы на розных этапах яе развіцця амаль адсутнічала навуковая цікавасць да прыкмет і павер'яў. Доўгі час вывучэннем гэтых жанраў не займаліся. Гэта, напэўна, тлумачыцца тым, што дадзеная "...частка народнай словатворчасці ніяк не ўштукоўвалася ў разгалінаваную сістэму вуснапаэтычных жанраў, сарамліва замоўчвалася фалькларыстамі, нібы была з'яваю, якой трэба саромецца, якую лепш не згадваць, каб не зрабіць дрэнную паслугу народу" [9, с. 6]. Дастаткова разнастайныя і багатыя запісы з XIX ст. аказаліся незапатрабаванымі, хаця можна з поўным правам сцвярджаць, што гэтыя жанры яскрава адлюстроўваюць асаблівасці народнага мыслення, светапогляду. Менавіта прыкметы і павер'і дазваляюць больш глыбока спасцігнуць, зразумець сутнасць і вытокі народнай творчасці, растлумачыць міфалагічную аснову шматлікіх абрадаў і звычаяў.

Асобнымі аспектамі вывучэння прыкмет і павер'яў займаліся айчынныя навукоўцы В.Бандарчык, Л. Мінько. У даследаванні Л. Мінько "Прымхі і прыкметы" разглядаюцца вераванні, звязаныя з чараўніцтвам, любоўная, сельскагаспадарчая і прамысловая магія, розныя "бытавыя прымхі і забабоны". Даследчык бачыць прычыну іх жывучасці ў асаблівасцях чалавечай псіхікі, у спосабах успрыняцця навакольнага свету, у вялікай павазе да традыцый і звычаяў.

Факт універсальнасці і старажытнасці веры ў прыкметы адзначае вядомы рускі даследчык С. Токараў, які падзяляе іх на тры вялікія катэгорыі: 1) "народныя прыкметы, што датычаць галоўным чынам надвор'я і яго верагодных перамен ("стыхійныя"); 2) "прыкметы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заснаваныя на сістэматычных назіраннях, так званыя “навуковыя” (ці тыя, што не супярэчаць навуцы) прадказанні надвор’я”; 3) “прымхлівыя”, бытавыя прыкметы, па большай частцы не адносяцца ні да надвор’я, ні да каляндарных звычаяў і павер’яў” [21, с. 55-56]. Даследчык падзяляе метэаралагічныя прыкметы на тры групы (пры гэтым адразу адмаўляючы падзел на рэальныя і прымхлівыя, так, як, напрыклад, гэта робіць А. Афанасьеў): 1) кароткатэрміновыя (надвор’е на заўтра); 2) доўгатэрміновыя (вясна, лета); 3) фіксаваныя [21, с. 58]. Гэты погляд падзяляюць З. Балтаровіч, Я. Мароз, А. Фядорыў [14], якія размяркоўваюць традыцыйныя метэаралагічныя прыкметы на такія ж семантычныя групы.

Заўважым, што ў сярэдзіне 90-х гадоў XX ст. адраджаецца навуковая цікавасць да прыкмет і павер’яў. У 1995 годзе выходзіць даведнік У. Коваля “Народныя ўяўленні, прыкметы і павер’і” [10], у якім знайшлі адлюстраванне сістэматызаваныя звесткі па 180 міфонімах. Народна-міфалагічныя ўяўленні, павер’і і прыкметы падаюцца тут у шырокім фальклорна-літаратурным кантэксце.

З прац, прысвечаных беларускім прыкметам і павер’ям, неабходна адзначыць кнігі У.Васілевіча: “Зямля стаіць пасярод свету…” (1996 г.), “Жыццядвечны лад…” (1998 г.), “Зямная дарога ў вырай…” (1999 г.). Фактычны матэрыял для кніг сабраны амаль са 150 крыніц. Аўтар-укладальнік размеркаваў звесткі паводле тэматычна-функцыянальнага прынцыпу. У першай кнізе прадстаўлены прыкметы і павер’і, якія датычаць прыроды ва ўсіх яе праявах, жывёльнага і расліннага свету, чалавека і яго маральна-этычных нормаў, побыту. Другая кніга прысвечана народным вераванням, звязаным з каляндарнымі і сямейнымі абрадамі. Змест трэцяй кнігі склалі павер’і, звязаныя са старажытнымі вераваннямі беларусаў, з варажбою, тлумачэннямі сноў, чарадзействам і знахарствам. Кнігі суправаджаюцца ўступнымі артыкуламі, дзе аўтар разглядае шырокі тэматычны дыяпазон прыкмет і павер’яў, дае іх азначэнне, гаворыць аб значэнні і ролі народных уяўленняў у духоўнай спадчыне беларусаў. Даследчык справядліва адзначае, што “…нягледзячы на досыць працяглую гісторыю збірання і публікавання, народныя прыкметы і павер’і тым не менш былі пазбаўлены больш-менш грунтоўнага філалагічнага аналізу з боку фалькларыстаў” [9, с. 9].

У кнізе расійскага даследчыка І. Панкіева “Рускія абрады і прымхі” (1998) змешчаны старадаўнія прыкметы і павер’і аб асноўных падзеях у жыцці чалавека. Аўтар асэнсоўвае вялікі пласт старажытных містычных павер’яў, метэаралагічных прыкмет, раскрывае глыбінны сэнс міфалагічных уяўленняў, звязаных з камянямі і раслінамі, бачаннем сноў.

Прыкметам і павер’ям прысвечаны шэраг артыкулаў (“Прыкметы як адзін з жанраў народнай творчасці”, “Звычайны дзень беларускага селяніна ў прыкметах, павер’ях і правілах” (2004 г.)) сучаснай даследчыцы Т. Валодзінай [4]. Аўтар адзначае функцыі і ролю гэтых малых жанраў, звяртаецца да метэаралагічных прыкмет, прыкмет-знакаў смерці, прыкмет і павер’яў, што суправаджаюць звычайны дзень беларускага селяніна. Даследчыца справядліва сцвярджае, што “прыкметы, павер’і і правілы – сістэма як агульных, так і канкрэтных уяўленняў пра сувязь, з аднаго боку, індывіда і соцыуму, з другога – свету прыроды і ўсяго Космасу (у яго бачнай і нябачнай частках)” [4, с. 366].

Такім чынам, прыкметы і павер’і, як і іншыя фальклорныя жанры, здаўна выклікалі пільную ўвагу з боку збіральнікаў, аднак “несканцэнтраванасць, а парою цяжкадаступнасць і нявылучанасць матэрыялу (часта прыкметы і павер’і былі прадстаўлены ў рамках іншых жанраў) ускладняюць сёння задачу па выяўленні такога найцікавейшага раздзела вуснай творчасці народа” [19, с. 7]. На працягу доўгага часу прыкметы і павер’і як асобныя самастойныя жанры беларускага фальклору не даследаваліся. Пачатак збору і вывучэння прыкмет і павер’яў быў пакладзены ў XIX ст., аднак у савецкі час гэтыя жанры засталіся па-за ўвагай навукоўцаў.

Вывучэнне прыкмет і павер’яў адбывалася па некалькіх напрамках:

- класіфікацыя прыкмет і павер’яў (даследчыкі Дз. Булгакоўскі, М. Нікіфароўскі, М.Федароўскі, Ч. Пяткевіч, А. Сержпутоўскі, С. Токараў, У. Васілевіч і інш.; абралі розныя прынцыпы класіфікацыі – ад тэматычнага да гісторыка-філасофскага);
- даследаванне міфалагічнай асновы, жанравых асаблівасцей і генетычных крыніц прыкмет і павер’яў (У. Даль, А. Афанасьеў і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

• навуковае асэнсаванне прыкмет і павер'яў (А. Багдановіч, П. Дземідовіч, Л.Мінько, У. Васілевіч, Т. Валодзіна і інш.).

Важнасць нашай працы прадыктавана значнай колькасцю сабранага на тэрыторыі Гомельшчыны ў апошняе дзесяціголдзе новага фактычнага матэрыялу па прыкметах і павер'ях і неабходнасцю яго параўнання з запісамі фальклярыстаў мінулых стагоддзяў, а таксама абумоўлена перспектывай правядзення далейшых даследаванняў.

**Abstract.** History of collecting and studying tokens and superstitions is presented in the paper. It is shown that the study was exercised in the following directions: classification, the study of mythological base, genre peculiarities and origin sources of tokens and superstitions and their scientific comprehension.

**Літаратура**

1 Афанасьев, А.Н. Происхождение мифа, метод и средства его изучения // Народ-художник / А.Н. Афанасьев. – М.: Советская Россия, 1986. – С. 219-256.

2 Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Минск: Беларусь, 1995. – 187 с.

3 Булгаковский, Д. Пинчуки. Этнографический сборник. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверия и местный словарь // Записки ИРГО по отделению этнографии / Д. Булгаковский. – СПб., 1890. – Т. 23. – С. 170-192.

4 Валодзіна, Т.В. Прыкметы і павер'і // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор [Тэкст] / Т.В. Валодзіна. – Мінск: Бел. навука, 2004. – С. 330-367.

5 Даль, В.И. О повериях, суевериях и предрассудках русского народа / В.И. Даль. – СПб., Литера, 1996. – 480 с.

6 Демидович, П. Из области верований и сказаний белорусов // Этнографическое обозрение. Издание этнографического отдела Императорского Общества Любителей Естествознания, Антропологии и Этнографии, состоящего при Московском университете / П. Демидович. – М., 1896. – №1. – С. 90-120.

7 Дмитриев, М.А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края / М.А. Дмитриев. – Вильно: Печатня А. Г. Сырбина, 1869. – 264 с.

8 Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник. Ч. 1. // Записки ИРГО по отделению этнографии / В. Н. Добровольский. – СПб.: Типография Евдокимова, 1891. – Т.20. – 308 с.

9 Зямля стаіць пасярод свету… Беларускія народныя прыкметы І павер'і. Кн. 1. [Тэкст] / [Уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча] – Мінск: Мастацкая літаратура, 1996. – 591 с.

10 Коваль, У. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі [Тэкст] / У. Коваль. – Гомель: Беларускае агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.

11 Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Этнографический сборник, издаваемый Императорским Русским Географическим Обществом. Вып. III. / А. Киркор. – СПб.: Типография Эдуарда Праца, 1857. – С. 151-276.

12 Ляцкий, Е. Болезнь и смерть по представлениям белорусов // Этнографическое обозрение. Издание этнографического отдела Императорского Общества Любителей Естествознания, Антропологии и Этнографии, состоящего при Московском университете / Е. Ляцкий. – М.:1892. – кн. XII-XIV – № 2-3. – С. 23-42.

13 Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1897. – с. 307+примечания (МФ 614).

14 Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / [Отв. редактор В. К. Бондарчик]. – Минск: Наука и техника, 1987. – 176 с.

15 О приметах // Минские епархиальные ведомости. – 1884. – № 15. – С. 425- 434.

16 О приметах // Минские епархиальные ведомости. – 1884. – №16. – С. 444-463.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

17 Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе [Тэкст] / Ч. Пяткевіч. [Уклад., прадм. У. Васілевіча; Пер. с пол. Л. Салавей і У. Васілевіча]. – Мінск.: Беларускі Кнігазбор, 2004. – 672 с. [4] с.: іл.; – ("Беларускі кнігазбор": Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

18 Радченко, З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские), записанные в Дятловицкой волости Гомельского уезда Могилёвской губернии Зинаидой Радченко // Записки ИРГО по отделению Этнографии. Том XIII, выпуск II. / [Под ред. Ф.М. Истомина]. – СПб: Типография В. Безобразова и комп., 1888. – 315 с.

19 Романов, Е. Белорусский сборник. – Т.1. Губерния Могилёвская. Вып. 1, 2. Песни, пословицы, загадки / Е. Романов. – Киев: Типография С. В. Кульженко, 1885.

20 Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў [Тэкст] / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

21 Токарев, С.А., Филимонова, Т.Д. Обряды и обычаи, связанные с растительностью // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: исторические корни и развитие обычаев / С.А. Токарев, Т. Д. Филимонова. – М.: Наука, 1983. –С. 145-149.

22 Шлюбскі, А.Л. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны.Ч.2. [Тэкст] / – Мінск: Інстытут беларускай культуры, 1928. – С. 221-222.

23 Шейн, П.В. Белорусские народные песни, с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями, с приложением объяснительного словаря и грамматических примечаний / П.В. Шейн. – СПб.: Типография Майкова, 1874.

24 Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т.III. – СПб.: Типография императорской академии наук, 1902. – Сборник отделения русского языка и словесности императорской академии наук. – Т. 72, № 4. / П.В. Шейн. – СПб, 1903.

25 Шпилевский П. Исследования о волколаках на основании белорусских поверий // Московитянин: учебно-литературный журнал. Т.2. / П. В. Шейн. – М.: Типография В. Готье, Университетская, Степанова, 1853. – С. 1-2.

26 Federowski M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej. – Kraków, 1897. – T. 1.; Kraków, 1902 – T. 2.

27 Moszyński K. Kultura ludowa słowian, cz 2. – Krakow , 1934.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 16.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ